# ГАЛІНЫ МІЖЭТНІЧНЫХ КАНТАКТАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў XIX СТ.

**Р. А. Колас**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*kolosrodion@gmail.com*
*Навуковы кіраўнік – Т. А. Навагродскі, доктар гістарычных навук, прафесар*

Дадзены артыкул прысвечаны даследаванню абласцей міжэтнічных кантактаў насельніцтва Беларусі ў XIX ст. Мэта артыкула – вызначыць сферы камунікацыі этнічных меншасцяў Беларусі з дамінуючай этнічнай супольнасцю з дапамогай прыцягнення этналінгвістычнага матэрыялу. Да вынікаў даследавання адносіцца вызначэнне галін кантактаў, вылучэнне механізмаў, а таксама раскрыццё ролі імагалагічных канструктаў ў фарміраванні дадзеных адносін.

***Ключавыя словы:*** этнамоўныя працэсы; этнамоўная прастора; этнакультурная прастора; міжэтнічныя стасункі; этнічная самаідэнтыфікацыя.

# ОБЛАСТИ МЕЖЭТНИЧЕСКИХ КОНТАКТОВ НАСЕЛЕНИЯ БЕЛАРУСИ В XIX В.

**Р. А. Колос**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4,*
*220030, г. Минск, Беларусь, kolosrodion@gmail.com*
*Научный руководитель – Т. А. Новогродский, доктор исторических наук, профессор*

Данная статья посвящена исследованию областей межэтнических контактов населения Беларуси в XIX в. Цель статьи – определить сферы коммуникации этнических меншинств Беларуси с доминирующим этническим сообществом, с помощью использования этнолингвистического материала. К результатам работы относится определение областей контактов, выделение механизмов, а также раскрытие роли имагологических конструктов в формировании данных отношений.

***Ключевые слова:*** этнолингвистические процессы; этноязыковое пространство; этнокультурное пространство; межэтнические отношения; этническая самоидентификация.

**Пастаноўка праблемы.** Разгортванне этнамоўных працэсаў на тэрыторыі Беларусі пачалося з усталявання match рознабаковых стасункаў паміж першымі сфарміраванымі анклавамі балтаў і славянаў. Далейшае развіццё этнамоўных працэсаў было абумоўлена паглыбленнем гэтых сувяззяў, утварэннем новых спосабаў і механізмаў узаемадзеяння, уключэннем у гэтыя сувязі новых этна-канфесійных груп. Спалучэнне

славянскага элемента і балцкага субстрата адыграла ключавую ролю ў фарміраванні беларускага этнаса. Разам з гэтым, відавочныя ўплывы татарскага, цыганскага, габрэйскага, польскага, рускага элементаў здолелі сфарміраваць шматэтнічную, шматканфесійную і шматмоўную мясцовасць [1, с. 23–56].

**Метадалогія даследавання.** Навукова-метадалагічная праблема даследавання этнамоўных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ХІХ ст. выклікана немагчымасцю кантактавання з непасрэднымі носьбітамі гаворкі замацаванай у часе і прасторы (сама па сябе дадзеная праблема агульная для рэтраспектыўнага аналізу этнічных працэсаў). На дадзеную праблему звяртаў увагу Ф. дэ Сасюр: *«тыповай праявай сінтагмы з'яўляецца сказ, а ён належыць гутарцы, а не мове»*, але вырашэнне гэтай праблемы палягае ў плоскасці прыцягнення шырокага кола этнаграфічных крыніц, якія ўтрымліваюць этналінгвістычны матэрыял (прамое адлюстраванне сінтагм): фальклорныя апавяданні, рэлігійныя тэксты, этнаграфічныя нататкі (спевы, парэміялогія) і г.д. [2, с. 172].

**Фарміраванне этнамоўнай прасторы Беларусі.** У канцы XVIII–XIX стст. адбываецца фарміраванне *«класічнай»* этнічнай культуры беларусаў. Разам з гэтым, паступова мадэрнізацыйныя працэсы ў грамадстве спрыяюць уцягванню беларусаў у больш актыўныя кантакты з іншымі народамі, адбываецца кадыфікацыя беларускай мовы з улікам элементаў міжэтнічнага ўплыву, канчаткова складваецца і замацоўваецца культурна-рэгіянальны падзел Беларусі [3, с. 76–79].

Згодна з дадзенымі П.Ё. Шафарыка, этнамоўная прастора Беларусі разаслалася па тэрыторыі Падзвіння і Падняпроўя (Цэнтральнай і Усходняй Беларусі); Панёманне Шафарыкам пазначалася ў якасці *«ліцвінскага»* рэгіёна; Палессе Шафарык адносіў да своеасаблівай прамежкавай вобласці паміж тэрыторыяй рассялення *«маларосаў»* і палякаў). Таксама, этнамоўная прастора беларусаў праходзіла ўздоўж рэкаў Заходняя Дзвіна, Дняпро, часткова займала Прыпяць і Бярэзіну [4, с. 97–160].

Падобная тэрыторыя рассялення беларусаў сустракаецца на «Этнографической карте Европейской России» Пятра Кепена 1853 г. Відавочна, што аўтар мапы ў падмурак яе стварэння паклаў прынцып губернскага падзелу: тэрыторыя рассялення беларусаў сягае ад Брэст-Літоўска да Смаленску і ад Чарнігаву да Вільні. [5, с. І].

**Галіны міжэтнічнай камунікацыі.** Аднымі з этнаканфісійных анклаваў, якія засялілі тэрыторыю Беларусі ў XIV ст., былі татары. На працягу стагоддзяў яны стваралі свае Слабоды, захоўвалі сваю культуру цераз гаспадарчыя заняткі (садоўніцтва, рымарства, жывёлагадоўля, гарбарства), сацыяльны лад і рэлігійныя практыкі ісламу. Уплыў гэтай гру-

пы назіраўся ў галінах гаспадарчай справе (у значнай ступені – жывёлагадоўлі). Арэялы рассялення татараў можна вызначыць у межах Трок, Коўна, Вільні, Ліды, Навагрудка, Гродна. Дзякуючы масіву слоў, якія патрапілі ў беларускую мову, можна вылучыць кола заняткаў татараў, а таксама галіны міжэтнічнай камунікацыі: жывёлагадоўля / конегадоўля (курдзюк – адлажэнне тлушчу ў барана ля хваста; табун; войлак; бунчуг – дрэўка з прывязаным хвастом каня або яка, якое служыла ў XV–XVIII стст знакам улады, баран, барсук). Відавочным становіцца ўплыў на культуру харчавання: арбуз, качан, казан, балык – падсоленая рыба, таган – жалезнае кола для гатавання ежы, цюцюн / тытунь – табак [6, с. 175–177].

Буйны ўплыў беларускай культуры на татараў назіраецца менавіта ў XIX ст. (*«залатое стагоддзе татарскай кніжнасці»*) у галінах канфесійнага ўзаемадзеяння: ствараецца шэраг перакладаў ісламскай экзігезы з дапамогай хрысціянскай тэрміналогіі, адбываецца ўзбагачэнне традыцыйных формаў святкавання Вялікадня і Курбан-байрама [7, с. 3–15].

Вартым увагі з’яўляецца ўплыў «ідышызмаў» на беларускую мову. Карэктней казаць пра наяўнасць германізмаў у беларускай мове, якія патраплялі ў яе цераз ідыш (праз габрэйскі этнічны элемент). Сярод масіву такіх словаў можна вылучыць: дах (das Dach ), цукар (das Zucker), гандаль (der Handel), гвалт (die Gewalt), вага (Waage), вандраваць (wandern), кляштар (Kloster), верш (Vers), віншаваць (wünschen), друкаваць (drucken), шпіталь (Spital), шуфляда (Schublade), цэгла (Ziegel), фэст (Fest), фарба (Farbe), фальварак (Vollwerk), сурвэтка (Serviette), грошы (Grosch). Такі ўплыў быў двухбаковы: у габрэйскай мове таксама сустракаецца шэраг беларускіх словаў, што было абумоўлена доўгім і цесным суіснаваннем народаў. Пераважная колькасьць габрэйскай меншасці займалася дробным гандлем і рамяством. Асабліва значную ролю габрэі адыгрывалі ў сталярным, шавецкім і ювелірным рамёствах. Вельмі распаўсюджаны былі фактарства, шынкарства, дробны гандаль, арандатарства [8, с. 331–335].

Што тычыцца этнамоўнага ўплыву між цыганамі і стараабрадцамі, тут варта адзначыць, што замкнёны характар гэтых этнакультурных груп не спрыяў узнікненню інтэнсіўнай міжмоўнай і міжкультурнай камунікацыі. Большасць цыганоў і стараабрадцаў пераняла моўныя канструкты беларускага насельніцтва. З XVIII ст. сярод стараабрадцаў пашыраюцца заняткі гандлем. Стараабрадцы Беларусі мелі цесныя сувязі з усімі стараабрадніцкімі абшчынамі, што вельмі спрыяла развіццю гандлю. Галоўную ролю адыгрывалі веткаўскія купцы, якія былі пасрэднікамі ў гандлі з Расіяй. Цыгане традыцыйна сяліліся на ўскраінах гарадоў і пасёлкаў, займаючыся рамёствамі, гандлем, варажбой і іншымі

заняткамі; вядома, што ў Міры яны заснавалі некалькі мануфактураў [9, с. 258].

**Высновы.** Вывучэнне галінаў міжэтнічных камунікацый дазваляе вызначыць ўплыў міжэтнічных стасункаў на фарміраванне этнічнай самаідэнтычнасці беларусаў і акрэсліць новае праблемнае поле для айчынай антрапалагічнай навуцы. Увядзенне ў беларускую гістарыяграфію новых антрапалагічных тэрмінаў як *«выспы этнічнай культуры»* дазваляе на падставе этнаграфічных напрацовак і этнаграфічных мап акрэсліць рассяленне этнаканфісійных анклаваў на тэрыторыі Беларусі, а этналінгвістычны матэрыял раскрывае асноўныя галіны камунікацыі паміж беларусамі і прадстаўнікамі іншых этнасаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Пилипенко М. Ф.* Возникновение Белоруссии : новая концепция. Мн. : Беларусь, 1991.
2. *Saussure de F.* Cours de linguistique générale / F. de Saussure // edit. C. Bally et A. Sechehaye, A. Riedlinger (collector). Paris : Payot, 1971.
3. *Мікуліч Т. М.* Мова і этнічная самасвядомасць. Мн. : Навука і тэхніка, 1996. 1
4. *Šafárik P. J.* Slovanské Starožitnosti. Praha : Nákladem kněhkupce Bedřicha Tempského, 1863.
5. *Кеппен П. И.* Об этнографической карте Европейской России.СПб. : Имп. Рус. геогр. о-во, 1853.
6. *Бірыла М. В.* Выбраныя працы / укладальнікі: Л. А. Ліхадзіеўская, В. П. Русак, Н. А. Чабатар ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа. Мн : Беларуская навука, 2017.
7. Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук. Цэнтр даследавання старадрукаў і рукапісаў. Хамаіл. 1872 г. П19-20/Нр27 ИОРкВ1987. 164 арк.
8. *Иоффе Э. Г.* К вопросу о взаимовлиянии еврейских и славянских языков и культур // Першы міжнародны кангрэс беларускай культуры. Мн. : «Права і эканоміка», 2016. С. 331–335.
9. *Kalinin V.* Zagadka baltiĭskikh tsygan : ocherki istorii, kul’tury i sotsial’nogo razvitiia baltiĭskikh tsygan. Mn. : Logvinov, 2005.